**Заключэнне.** Такім чынам, даследаванне назваў двара і гаспадарчых пабудоў у народна-дыялектнай мове Віцебшчыны сведчыць пра выключнае багацце і разнастайнасць побытавай рэгіянальнай лексікі, якая функцыянуе ў народных гаворках паўночна-ўсходняй часткі Беларусі. Прааналізаваны лексічны матэрыял дастаткова выразна адлюстроўвае нацыянальную ідэнтычнасць і самабытнасць нашага народа як самастойнай нацыі, нясе ў сабе выразную лінгвакраіназнаўчую інфармацыю пра беларусаў як людзей, якія любяць і паважаюць працу, з'яўляюцца добрымі гаспадарамі і ўмельцамі.

1. Рэгіянальны слоўнік Віцебшчыны : у 2 ч. / Л.І. Злобін (рэд.) [і інш.]. – Віцебск : УА "ВДУ імя П.М.Машэрава", 2012. – Ч. 1. – 304 с.
2. Рэгіянальны слоўнік Віцебшчыны : у 2 ч. / склад. : Г.К. Семянькова, Т.А. Грачыха, А.С. Дзядова [і інш.] ; пад рэд. А.С. Дзядовай. – Віцебск : ВДУ імя П.М. Машэрава, 2014. – Ч. 2. – 358 с.
3. Слоўнік Сенненшчыны ў 3 т. Т. 1: А–К / Нац. акад. навук Беларусі, Цэнтр даслед. беларус. культ., мовы і літ-ры, філ. "Ін-т мовы і літ. імя Я. Коласа і Я. Купалы"; уклад.: Н.М. Бунько [і інш.]; рэд. В.М. Курцова, Л.П. Кунцэвіч. – Мінск : Беларус. навука, 2013. – 296 с.

## ВЫРАЖЭННЕ МАЎЛЕНЧЫХ СТРАТЭГІЙ У МАСТАЦКІМ ТЭКСЦЕ (НА ПРЫКЛАДЗЕ ПАЭМЫ ЯКУБА КОЛАСА "НОВАЯ ЗЯМЛЯ")

***Сямчонак Л.Д.,***
*студэнтка ВДУ імя П.М. Машэрава, г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь*
*Навуковы кіраўнік –* ***Мартынкевіч С.В.,*** *канд. пед. навук, дацэнт*

Ключавыя словы. Маўленне, вобраз, маўленчыя характарыстыкі.
Key words. Speaking, image, speech characteristics.

Вобраз героя мастацкага твора складаецца з мноства фактараў: характар, знешнасць, прафесія, захапленні, выяўлення сябе, стасункі з навакольным светам і інш. Адзін з галоўных элементаў літаратурнага твора – гэта маўленне персанажа, якое ў поўнай меры раскрывае ўнутраны свет і лад жыцця герояў. Таленавіта створаная моўная характарыстыка літаратурнага героя – важная дэталь у партрэце персанажа.

Адным з інструментаў аўтара мастацкага твора з'яўляюцца маўленчыя характарыстыкі. Выказванні герояў ўключаюць пэўныя стратэгіі маўленчых паводзін. У адзін рад з паняццем "маўленчая стратэгія" можна паставіць паняцце "маўленчая тактыка", якое вызначаецца як асобны ход у межах стратэгіі. У мастацкім творы маўленчыя стратэгіі і тактыкі рэалізуюцца пасродкам моўных адзінак.

Актуальнасць даследавання вызначаецца неабходнасцю больш дэталёвага вывучэння моўных асаблівасцей класічных твораў, яркім прыкладам чаго з'ўляецца паэма Якуба Коласа "Новая зямля". Гэта дапаможа глыбей пранікнуць у творчую лабараторыю аўтара, зразумець, што хацеў данесці аўтар да чытача праз маўленне героя.

Мэта даследавання – прааналізаваць моўныя сродкі, якія прэзентуюць маўленчыя стратэгіі і тактыкі галоўнага героя паэмы Якуба Коласа "Новая зямля", што дазволіць выявіць мастацкі талент і асаблівасці творчай манеры аўтара.

**Матэрыял і метады**. Матэрыял даследавання – тэкст паэмы Якуба Коласа "Новая зямля" [2], моўныя адзінкі, якія эалізуюць маўленчыя стратэгіі герояў паэмы. Асноўныя метады даследавання – аналітычны і апісальны.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Маўленчыя стратэгіі паводзін падзяляюцца на наступныя групы: стратэгіі маўленчага інфармавання (стратэгіі маўленчых паводзін, якія накіраваныя на абмен інфармацыі паміж аўтарам і яго атрымальнікам) і стратэгіі маўленчага ўздзеяння (стратэгіі маўленчых паводзін, накіраваныя на ўздзеянне аўтара на атрымальніка). Само маўленчае ўздзеянне можа быць прамым, ускосным і схаваным, і зыходзячы з гэтага стратэгіі маўленчага ўздзеяння падзяляюцца на стратэгіі прамога маўленчага ўздзеяння і схаванага ўздзеяння. Кожны від выдзяляецца як асобны від стратэгій [1].

Загадны лад дзеясловаў паказвае, што асоба пабуджае каго-небудзь выканаць дзеянне: загад, патрабаванне, просьбу, заклік і інш. Для загаднага ладу характэрныя асобая інтанацыя і экспрэсіўнасць.

Пры выражэнні камунікатыўных намераў галоўнага персанажа паэмы Якуба Коласа "Новая зямля" Міхала большасць дзеясловаў ужыта ў форме загаднага ладу: **рабі, бяры, цягні, вязі**, **маўчы, не гніся** і інш.Выкарыстанне дзеясловаў у такой форме выяўляе героя як вельмі патрабавальнага чалавека, які гатовы ісці да сваёй мэты. Выразы, у якіх ужываюцца дзеясловы ў форме загаднага ладу, не з'яўляюцца зваротам да нейкай пэўнай асобы, яны адрасуюцца ўвогуле ўсім сялянам.

**Маўчы**, калі ёсць хлеб у роце! [2, с. 31].

Выражэнне маўленчага дзеяння ў выказваннях Міхала спалучаецца з эмоцыямі: селяніну для шчасця многа не трэба.

Зямля… зямля… туды, туды, брат,
**Будуй** яе… ты **дай** ёй выгляд…
На новы лад, каб жыць нанова…
**Не кідай** іх.. Га-а-х! І – гатова! [2, с. 331].

Міхал заўсёды клапоціцца пра сваю сям'ю, таму для яго неабыякавае тое, што будзе надалей з яго дзецьмі, з іх навучаннем. Герой звяртаецца да хатняга настаўніа:

А ты, дарэктар, **ведай** дзела:
**Прыпры** іх добра, як вужакаў… [2, с. 155].

Выражэнне загаду падмацавана трапным параўнаннем: Міхал наказвае дарэктару, каб ён не песціў дзяцей, а выхоўваў іх вельмі строга.

Галоўнага героя вельмі хвалюе тое, што ён ніяк не можа набыць уласную зямлю. Міхалу хочацца хутчэй пазбавіцца ад служэння пану, залежнасці ад яго. Рытарычныя пытанні ўтрымліваюць формы загаднага ладу дзеясловаў, што больш выразна дапамагае героям выказаць сваю нязгоду:

Або ты знойдзеш праўду ў свеце?
Каму пажаліцца, **скажэце** [2, с. 157].

Герой спадзяецца на далейшае шчаслівае а, галоўнае, свабоднае жыццё. Міхал верыць, што без паноў іх жыццё стала б намнога лепшым. Таму маўленню Міхала ўласціва і ўжыванне дзеясловаў умоўнага ладу, якія выражаюць стратэгіі ўздзеяння не прама, а ўскосна: **паказаў бы, не валяўся б**, **жыў бы, не знаўся б** і інш. Умоўны лад абазначае дзеянне як магчымае пры пэўных умовах. Ужыванне такой формы дзеяслова сведчыць пра няўпэўненасць у сваіх дзеяннях, пра магчымасць атрымаць жаданае толькі пры пэўных умовах.

Міхал кожны дзень змагаецца за сябе і сваю сям'ю, за ўласны куток зямлі. Але на шляху ў героя ўзнікаюць пэўныя цяжкасці, перашкоды, якія герой павінен пераадолець, каб атрымаць жаданае. Для галоўнага героя кожны новы дзень – гэта пераадоленне перашкод.

Узмацняюць стратэгію ўздзеяння дзеясловы ў форме будучага часу:

А **пажывем** – яшчэ **пачуем**,
А тут, хоць як мы ні мяркуем,
Але нічога **не даб'емся**… [2, с. 192].

Галоўны герой не страчвае надзеі на светлае будучае.

Міхал выкарыстоўвае маўленчыя стратэгіі, якія выяўляюцца праз дзеясловы **купіць, прыдбаць, выпутацца, зажыць** і інш. Гэта паказвае настрой героя, яго смелы і ваяўнічы характар. Герой не збіраецца проста так адступаць ад сваёй мэты, ён гатовы змагацца да апошняга, дзеля спакою і шчасця сябе і сваёй сям'і.

Для Міхала зямля з'яўляецца святыняй, крыніцай дабрабыту:

Зямля дасць волі, дасць і сілы,
Зямля паслужыць да магілы…[19, с.73].

Заўважым, што ў маналогу героя слова "зямля" паўтараецца неаднаразова. Зямля ў жыцці героя мае вялікую значнасць.

**Заключэнне.** Такім чынам, стратэгіі Міхала разнастайныя адносна камунікатыўнай мэты і, адпаведна, моўнага выражэння. Выказванні насычаны дзеясловамі, якія як ключавыя адзінкі фарміруюць маўленне, змяняюць адценні размовы, дакладна перадаюць пачуцці героя – сумненні, радасць, гора і інш. Маўленчыя стратэгіі просьбы, загаду выражаюццая як непасрэдна, так і ўскосна, што характарызуе галоўнага героя як супярэчлівую камунікатыўную асобу. Пры гэтым Міхал ніколі не трымае ўсё ў сабе, а наадварот, заўсёды выказвае тое, што думае. Гэта сведчыць пра адкрытасць Міхала, прамалінейнасць.

Аналіз мовы паэмы "Новая зямля" выразна паказаў, што творы Якуба Коласа – ўзор высокага слоўна-выяўленчага майстэрства, а слоўнікавае багацце класіка беларускай літаратуры – скарбніца для вывучэння і даследавання ў розных аспектах.

1. Карасик, В.И. Характеристики педагогического дискурса / В.И. Карасик // Языковая личность: аспекты лингвистики и лингводидактики. – Волгоград : Перемена, 1999. – С. 3 – 17.
2. Колас, Я. Новая зямля / Якуб Колас. – Мінск : Маст. літ., 2007. – 333 с.

## МОЎНЫЯ СРОДКІ РЭПРЭЗЕНТАЦЫІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА ХАРАКТАРУ БЕЛАРУСАЎ У МОВЕ СУЧАСНЫХ ПЕРЫЯДЫЧНЫХ ВЫДАННЯЎ ВІЦЕБШЧЫНЫ

***Шылец К.С.,***
*студэнтка ВДУ імя П.М. Машэрава, г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь*
*Навуковы кіраўнік – **Дзядова А.С.,** канд. філал. навук, дацэнт*

Ключавыя словы. Культура, лексічная адзінка, моўныя сродкі, нацыянальна-культурны, нацыянальны характар.
Keywords. Culture, lexical unit, linguistic means, national-cultural, national character.

Мова з'яўляецца адным з найважнейшых фактараў развіцця культуры, яе багатым скарбам і адначасова складнікам, які атрымліваецца ў спадчыну ад продкаў і дапамагае захоўваць нацыянальна-культурныя каштоўнасці, назапашаныя тым ці іншым народам на працягу стагоддзяў.

Адным з аспектаў сучасных лінгвістычных даследаванняў з'яўляецца праблема ўзаемадзеяння мовы і культуры, у тым ліку адметнасці адлюстравання духоўнага свету народа праз сістэму моўных сродкаў. Актуальнасць нашага навуковага даследавання абумоўлена павышанай увагай сучасных мовазнаўцаў да вывучэння спецыфікі мовы рэгіёнаў з пункту гледжання этналінгвістыкі, сацыялінгвістыкі і лінгвакраіназнаўства. Гэта тлумачыцца тым, што ў айчыннай лінгвістыцы на сённяшні дзень недастаткова распрацаваным застаецца нацыянальна-культурны і сімвалічны аспект функцыянавання беларускай мовы ў рэгіянальным соцыуме. Мэта артыкула – вызначыць асаблівасці рэпрэзентацыі нацыянальных рыс характару беларусаў у мове сучасных перыядычных выданняў Віцебшчыны.

**Матэрыял і метады.** Даследаванне праведзена на матэрыяле наступных раённых газет Віцебшчыны : "Патрыёт" (Ушацкі раён), "Гарадоцкі веснік" (Гарадоцкі раён), "Голас Расоншчыны" (Расонскі раён). Выкарыстаны наступныя метады: апісальна-класіфікацыйны, а таксама метады сістэмнага аналізу, навуковага назірання, лінгвістычнага даследавання.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Як адзначае Ю.М. Бабіч, "сродкі масавай інфармацыі па-ранейшаму адыгрываюць істотную ролю ў жыцці грамадства. Нягледзячы на імклівае развіццё інтэрнэт-камунікацыі, друкаваныя перыядычныя выданні пакуль застаюцца папулярнымі і запатрабаванымі" [1, с. 317]. У апошнія гады ў перыядычных выданнях Віцебшчыны сустракаецца шмат публікацый, аўтары якіх выяўляюць цікавасць да тых ці іншых праяў духоўнай культуры і менталітэту нашага народа.

Паняцце "нацыянальны характар" з'яўляецца блізкім да паняццяў "менталітэт" і "ментальнасць". На думку праф. В.А. Маславай, "нацыянальны характар – катэгорыя, якая